WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

29 КАСТРЫЧНІКА 2010 г.
ПЯТНІЦА
№ 212
(26820)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ДЗЯКУЕ ГЕНАДЗЮ ЗЮГАНАВУ ЗА КАНСТРУКТЫЎНУЮ ПАЗІЦЫЮ Ў ПЫТАННІ БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКІХ АДНОСІН

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка дзякуе старшыні ЦК Камуністычнай партыі Расійскай Федэрацыі Генадзю Зюганаву за канструктыўную пазіцыю ў пытанні беларуска-расійскіх адносін. Аб гэтым заявіў учора кіраўнік беларускай дзяржавы на сустрэчы з Генадзем Зюганавым у Мінску.

«Дзякую Вам за тое, што хоць адзін чалавек у Расіі адгукнуўся на ўсё тое, што адбываецца, і прапанаваў, як вы сказалі, тэрмінова абмеркаваць праблемы для таго, каб пераканацца, што ж на самай справе адбываецца, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Зразумела, вы чалавек дасведчаны. Я вельмі ўважліва назіраю за вашай работай, за работай Кампартыі Расіі. Я думаю, вы ніколі не зможаце за паўтара дзясятка гадоў нашага знаёмства, нават больш, кінуць камень у мой агарод».

У прыватнасці, кіраўнік беларускай дзяржавы падкрэсліў, што «мы ніколі не саромеліся, калі было забаронена размаўляць аб сацыялізме, камунізме, нашым мінулым, Айчыннай вайне, падтрымцы НАТА, нашай абараназдольнасці». «Мы заўсёды з вамі падтрымлівалі добрыя адносіны. Наколькі магчыма, я заўсёды вас і партыю інфармаваў аб падзеях, што адбываюцца, гэта таксама апошнім часам пачало выклікаць нейкую нездаволенасць і алергію ў вашых улад. Але тым не менш я вельмі цаню тое, што вы звярнуліся да той праблемы, якая заўсёды хвалявала партыю і будзе хваляваць. Таму што гэта, напэўна, адзін з краевугольных камянёў у палітыцы Кампартыі Расіі», — адзначыў беларускі лідар.

«Я паглядзеў апошнія матэрыялы, даследаванні вашы, дзякуй, што вы іх перадалі. Нашы ацэнкі і нашы дзеянні ў Беларусі абсалютна такія, і тут разыходжанняў няма. Тым не менш ёсць вельмі шмат момантаў, якія я хацеў бы абмеркаваць з вамі, параіцца па некаторых пытаннях», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу, Генадзь Зюганаў перадаў беларускаму лідару прывітанне «ад усіх левых і народна-патрыятычных сіл». Ён пазітыўна ацаніў вынікі праведзенага нядаўна прэс-тура па Беларусі прадстаўнікоў рэгіянальных СМІ Расіі. «Знаёмства з гэтымі матэрыяламі (апублікаванымі па выніках прэс-тура. — Заўвага БЕЛТА) стварае добрую атмасферу для далейшага дыялога», — адзначыў Генадзь Зюганаў.

Акрамя таго, лідар КПРФ назваў «заслугоўваючай асаблівай увагі» практыку правядзення ў рэспубліцы Усебеларускіх народных сходаў, у якіх прымаюць удзел прадстаўнікі розных працоўных калектываў, сацыяльных слаёў, фармулюючы задачы развіцця краіны на бліжэйшыя гады.

Паводле павідамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

СЯРЭДНЯЯ ЗАРПЛАТА Ў БЕЛАРУСІ ДА КАНЦА 2010 ГОДА ЧАКАЕЦЦА НА ЎЗРОЎНІ $503 У ЭКВІВАЛЕНЦЕ

Паводле папярэдняй ацэнкі, да канца 2010 года сярэдняя заработная плата ў Беларусі павялічыцца да Br1 млн 576 тыс., або $503 у эквіваленце. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ва ўрадзе.

У жніўні гэтага года намінальная налічаная сярэдняя заработная плата склала Br1 млн 286,9 тыс., або $430 у эквіваленце.

Трэба адзначыць, што з 1996 года ў рэспубліцы штогод забяспечваецца рост заработнай платы. За апошнія 15 гадоў рэальная зарплата работнікаў Беларусі павялічылася ў 4,9 раза (для параўнання: у Расіі — у 2,5 раза, у Казахстане — у 3,1 раза, ва Украіне — у 2,7 раза).

Сярод краін СНД па велічыні заработнай платы ў доларавым эквіваленце Беларусь знаходзіцца на трэцім месцы пасля Расійскай Федэрацыі і Казахстана. Гэта звязана, у асноўным, з высокім узроўнем аплаты працы ў здабыўной прамысловасці дзвюх краін. Як сведчыць аналіз налічанай за ліпень 2010 года сярэдняй заработнай платы ў асобных краінах СНД, пералічанай па курсу нацыянальных валют у долары ЗША, у Расіі гэты паказчык склаў $695 (у 2005 годзе было $303, у 2009 годзе — $622), у Казахстане — $558 (адпаведна $256 і $453). У Беларусі сярэдняя зарплата ў ліпені гэтага года дасягнула $427, у 2005 годзе яна складала $215, у 2009 годзе — $350. У ліпені гэтага года ў Азербайджане сярэдняя заработная плата была $409, у Арменіі — $307, ва Украіне — $300, у Малдове — $243, у Кыргызстане — $157, Таджыкістане — $79.

ПАЛЯПШЭННЕ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЙ АБСТАНОЎКІ АДЗНАЧАЮЦЬ 38 ПРАЦЭНТАЎ ГРАМАДЗЯН КРАІНЫ

Паступовае паляпшэнне сацыяльна-эканамічнай абстаноўкі ў Беларусі адзначаюць 38 працэнтаў грамадзян Беларусі, 35,5 працэнта лічаць яе стабільнай. Такія звесткі маніторынгу грамадскай думкі, праведзенага 11—14 кастрычніка Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі, паведамляе **БЕЛТА**. На працягу верасня—кастрычніка істотных ваганняў у ацэнцы сацыяльна-эканамічнай сітуацыі не назіралася.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ ЯЎГЕНА ПРЫМАКОВА

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Гандлёва-прамысловай палаты Расійскай Федэрацыі Яўгена Прымакова з днём нараджэння.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ВІКТАР ЯНУКОВІЧ ДАРУЧЫЎ ЗАПУСЦІЦЬ НАФТАПРАВОД «АДЭСА—БРОДЫ» Ў АВЕРСНЫМ РЭЖЫМЕ

Прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч паставіў задачу запусціць нафтаправод «Адэса—Броды» ў аверсным рэжыме для пастаўкі нафты і газу з Каспійскага рэгіёну. Аб гэтым украінскі лідар паведаміў на прэс-канферэнцыі, якая прайшла ў час яго сустрэчы з азербайджанскім калегам Ільхамам Аліевым.

Прэзідэнт Азербайджанскай Рэспублікі Ільхам Аліеў заявіў, што Азербайджан гатовы далучыцца да праекта «Адэса—Броды». У канцы лістапада Украіна плануе ажыццявіць пробную прапампоўку 80 тыс. тон венесуэльскай нафты на Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод (Беларусь) з выкарыстаннем у аверсным рэжыме нафтаправодаў «Адэса—Броды» і «Дружба».

Кар. БЕЛТА.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.10.2010 г. (для б/н разлікаў)		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
1 долар ЗША ... 3 011,00	1 чэшская крона ... 168,54	USD ... 30,6786	Агенцтва Уладзіміра Грайцова
▲ 1 еўра ... 4 160,90	1 польскі злоты ... 1050,23	10 UAH ... 38,5846	
1 латвійскі лат ... 5 862,54	▼ 1 расійскі рубель ... 98,15	1000 BYR ... 10,1855	
1 літоўскі літ ... 1 204,81	1 украінская грыўня ... 378,67	EUR ... 42,4316	

ЮБІЛЕЙНЫЯ «ЗВАНЫ САФІІ»

У Полацку ў 15-ы раз праходзіць міжнародны фестываль арганнай музыкі «Званы Сафіі». «Зорныя» выканаўцы з Беларусі, Аўстрыі, Польшчы іншых краін бяруць удзел у гэтай культурнай падзеі.

Як расказалі «Звяздзе» ў аддзеле культуры Полацкага гарвыканкама, юбілейны фестываль сёлета праводзіцца ў рамках беларускай акцыі «Культурная сталіца». Прысвячаецца яшчэ аднаму юбілею — споўнілася 25 гадоў арганнай зале Сафійскага сабора.

Нагадаем, што першым сярод беларускіх гарадоў культурнай сталіцай з падачы кіраўніцтва Міністэрства культуры стаў менавіта Полацк. Гэты правінцыйны горад за апошнія гады вельмі папрыгажэў. Тут з вялікай цеплынёй зберагаюць тое, што дасталася нам ад продкаў. Рамантуюць, рэканструююць будынкі і храмы, з нуля аднаўляюць і ставяць новыя помнікі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НА ПРАСПЕКЦЕ ДЗЯРЖЫНСКАГА ПАБУДУЮЦЬ ДОМ ДАЎЖЫНЁЙ 700 МЕТРАЎ

На цотным баку праспекта Дзяржынскага плануецца пабудаваць 15-павярховы жылы дом даўжынёй 700 метраў. Пачнецца ён ад вуліцы Хмялеўскага і дойдзе да праспекта Жукава.

Як расказала галоўны архітэктар праекта Галіна Перліна, дом задуманы неперарыўным, ён будзе ўзвышацца нават над праезнай часткай вуліцы Шчорса: вялікая арка дазволіць транспарту рухацца па ёй. Прычым частка будынка каля скрыжавання праспекта Дзяржынскага і вуліцы Шчорса павінна мець паўкруглую ўвагнутую форму. Такім чынам, тут застанецца месца для пляцоўкі, дзе з часам могуць з'явіцца фантаны, скульптуры і іншыя элементы добраўпарадкавання. Непадалёк размесцяцца ўваходы на станцыю метро «Грушаўская». Два ніжнія паверхі новага будынка зоймуць грамадскія аб'екты.

ДА ЧС ПА ХАКЕІ 2014 ГОДА Ў СТАЛІЦЫ ПАБУДУЮЦЬ І РЭКАНСТРУЮЮЦЬ 20 ГАСЦІНІЦ

Гэта дазволіць штогод прымаць каля мільёна турыстаў. Сёння пры поўнай загрузцы сталічныя гатэлі здольныя прыняць толькі 600—700 тыс. чалавек у год. Цяпер у Мінску 28 гасцініц, у якіх можна размясціць 5,5 тыс. чалавек. Пасля ўзвядзення новых і рэканструкцыі дзейных гатэляў колькасць месцаў у іх вырасце амаль да 11 тыс.

«Мінск—Навіны».

У СТАМБУЛ — ПА ЭЛЕКТРОННЫМ БІЛЕЦЕ

Нацыянальная кампанія «Белавія» дала магчымасць пасажырам набываць электронныя білеты для палётаў з Мінска ў Стамбул.

У такога білета ёсць мноства пераваг, тлумачаць у кампаніі. Яго немагчыма згубіць ці страціць, паколькі ўся інфармацыя пра падарожжа надзейна захоўваецца ў сістэме браніравання. Электронны білет можна выслаць па электроннай пошце сябрам ці родным. Паколькі сістэмы рэгістрацыі і браніравання звязаныя паміж сабой, працэдура рэгістрацыі ў аэрапорце пройдзе хутчэй.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ISSN 1990 - 763X

Нашчадак Кісы Вараб'янінава

Выкрасці крэслы зрабіў спробу 41-гадовы рабочы прыватнай фірмы са Светлагорска. Гэта адбылося падчас абедзеннага перапынку з памяшкання кавярні, якая будуецца ля санаторыя «Сярэбраныя ключы».

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Гаспадары

БУЯКОВЫ АЛІГАРХ

Ганцавіцкі фермер Мікалай Рубан называе высакарослую акультураную расліну буякі «вечнай культурай», бо яна расце да паўстагоддзя і нават болей гадоў. Спачатку ён хацеў гадаваць звычайны сад — вішнёвы і яблыневы. Але...

— Пра яблыні я ведаю мала, а пра вішні наогул нічога, — прызнаецца гаспадар 30-гектарнай плантацыі і прыгадвае. — Садовымі буякамі у нас ніхто не займаўся, і я вырашыў рызыкнуць.

Калі ў вялікіх універсальных крамах сталіцы кшталту «Карона», «Прастор», «Еўрапейскі» ці «Юбілейны» давядзецца купляць расфасаваныя буякі памерам амаль з вішню, ведайце — гэтая смачная садавіна з фермерскай гаспадаркі «Сіняя птушка», якая месціцца непадалёк ад райцэнтра на колішніх балотна-лясных няўдобіцах. Калі Мікалай Рубан пачынаў асвойванне адпушчаных яму далёка не лепшых плошчаў, ягоныя знаёмыя мала верылі ў поспех справы. Было гэта дзесяць гадоў таму. Сёння ў фермера зусім іншыя задачы і клопаты: забяспечыць пасадачным матэрыялам фермерскія гаспадаркі, дзяржаўныя і недзяржаўныя сельгаспрадрыемствы Беларусі, Расіі, Літвы і Латвіі. Спачатку сам ездзіў у Германію за чаранкамі, а цяпер ён — асноўны ў краіне пастаўшчык, вырошчвае амаль 30 гатункаў, якія стабільна даюць багаты ўраджай карыснай для здароўя ягады.

— Некалі я ездзіў па калгасах і агітаваў старшынь і аграномаў заняцца развядзеннем гэтага даходнага віду садавіны, але на мяне глядзелі, як на дзівака, — прыгадвае Мікалай Рубан час, калі пра выведзеныя амерыканцамі садовыя буякі ў нас мала хто нават чуў. — Я вырашыў сам заняцца і на асабістым прыкладзе паказаць, чаго можна дасягнуць.

Але і гэтая справа, як і ўсё, што я рабіў па жыцці раней — мне таксама ў радасць!

А пачынаў ён з балот Палесся. Пасля лесатэхнічнага факультэта Беларускага тэхналагічнага інстытута патрапіў у навуковую сферу па вывучэнні Прыпяцкіх балотных біятопаў. Абараніў дысертацыю і нават напісаў навуковую кнігу. Потым праца прывяла ў Батанічны сад, дзе ён загадваў новаствораны лабараторыяй інтрадукцыі пладова-ягадных раслін. Лабараторыя атрымала прапіску пад Ганцавічамі — і «балотны спецыяліст» зноў аказаўся на Палессі. Па-сутнасці, лабараторыя была піянерам у развіцці прамысловага вырошчвання дзікарослых ягад, тут вяліся важныя навуковыя даследаванні. Цяпер гэтая ўстанова вядомая пад назвай «Журавінка» і займаецца ў асноўным прамысловым вырошчваннем журавін. Але Рубана захапілі буякі, і ён адважыўся пайсці менавіта па шляху стварэння фермерскай гаспадаркі. Цяпер пра гэтую расліну ён ведае амаль усё і ахвотна дзеліцца з іншымі, каму таксама цікава займацца ягадамі, названымі не толькі «буякамі», але і «дурніцамі».

Сёння ў «Сіняй птушцы», акрамя сына, працуюць яшчэ каля двух дзясяткаў чалавек, бо на плантацыі, як у любой гароднінна-садовай справе шмат ручной працы: чаранкаванне, перасадка і падсадка, падкормка і апрацоўка ад шкоднікаў і хвароб, збор ураджаю. Цяпер яшчэ і перадзімовая абрэзка кустоў (на фотаздымку). Мікалай Рубан хоча набыць сучасную машыну, каб механізаваць некаторыя віды працы і паскорыць працэс перасадак. Яшчэ ў фермерскай гаспадарцы наспела неабходнасць мець сваю халадзільную ўстаноўку для доўгатэрміновага захоўвання ўраджаю і нават цэх па вырабе буяковага соку.

— У мяне заўсёды ёсць да чаго імкнуцца, а ў маіх памагатых — за што працаваць. Калі гэты ягаднік стане дарослым, ён будзе даваць да 200 тон ягад у сезон.

Гэта, напэўна, і ёсць сапраўдная формула поспеху кіраўніка фермерскай гаспадаркі, паколькі Мікалай Рубан, як сапраўдны алігарх, плануе атрымліваць штогод некалькі мільярдаў рублёў.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Ганцавіцкі раён.

НА БРЭСТЧЫНЕ ПРЫГРЭЕ ДА ПЛЮС 15

У бліжэйшыя трое сутак тэрыторыя Беларусі будзе заставацца ў зоне павышанага ціску, таму ў суботу і нядзелю захаваецца камфортнае надвор'е без дажджоў, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.

У выхадныя чакаецца сонечнае надвор'е, толькі ўначы ў суботу па Віцебскай вобласці будуць невялікія дажджы. Пацяплее. Уначы будзе ад мінус 2 да плюс 5 градусаў, удзень у суботу — 5—11, па паўднёвым захадзе — да 13 цяпла. У нядзелю ўдзень прыгрэе да 7—13, па паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці — да 15 цяпла.

У панядзелак без істотных ападкаў, месцамі туман. Уначы — мінус 2—плюс 4, удзень — 5—12, па паўднёвым захадзе — да плюс 14 градусаў. Ужо ў аўторак надвор'е крыху пагоршыцца, таму 2 лістапада месцамі, а ў сераду паўсюдна пройдуць невялікія дажджы. Уначы — 1—6 цяпла, удзень — 7—14 градусаў. Згодна з папярэднімі прагнозамі, цёпла ў Беларусі будзе на працягу ўсяго першага тыдня лістапада. Стане халадней толькі напрыканцы першай дэкады месяца. Тады чакаецца ўначы 3—6 марозу, удзень — 0—6 цяпла. Ападкі прагназуюцца ў выглядзе дажджу і мокрага снегу.

Сяргей КУРКАЧ.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

«НЕ ЗАХАЦЕЎ АТРЫМЛІВАЦЬ ЗАРОБАК, БО НЯЗГОДНЫ З ГЭТЫМІ НАЛІЧЭННЯМІ»

Колішні палявод КСУП «Ломавічы» Акцябрскага раёна Генадзь Уладзіміравіч Каваленка не можа атрымаць заробак за працу ў гаспадарцы з красавіка да чэрвеня. Дакладней, не хоча — ад выплаты налічаных яму грошай ён адмовіўся. Заяўнік якраз не пагадзіўся з гэтымі налічэннямі, хоць і разумее, што расцэнкі не надта вялікія.

— Вось, напрыклад, за красавік у мяне было 26 працоўных дзён па 10 гадзін. Праца цяжкая, а налічылі мне за ўвесь месяц толькі каля 156 тысяч рублёў. Прыкладна такая ж гісторыя і па іншых месяцах, таму я і не стаў атрымліваць такія грошы. Скардзіўся ў пракуратуру, адтуль параілі, калі я нязгодны, падаваць у суд. А як падаць той іск, калі пры гэтым трэба плаціць дзяржпошліну? З якіх сродкаў? — гаварыў Генадзь Уладзіміравіч.

Дапамагчы разабрацца ў сітуацыі мы папрасілі **начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Акцябрскага райвыканкама Віктара РАШЭТНІКАВА**. Яго супрацоўнікі звязаліся ў сваю чаргу з КСУП «Ломавічы», даўшы нам частку патрэбнай інфармацыі (нормы выпрацоўкі, расцэнкі, фактычна выкананы аб'ём работы і адпрацаваны час, налічаныя грашовыя сродкі за красавік за адкрыццё буртоў ад зямлі), а потым у рэдакцыю патэлефанаваў і сам **кіраўнік гаспадаркі Аляксей РАШЭТНІКАЎ** (цёзка па прозвішчы). Ён патлумачыў змест папярэдне атрыманай намі таблицы, дзе цягам усяго красавіка была пазначана адпрацоўка нашым заяўнікам у кожны працоўны дзень 7 гадзін, а не 10, як сцвярджаў Генадзь Уладзіміравіч. Да слова, норма выпрацоўкі ў дзень складала 40 квадратных метраў (за выключэннем двух дзён — 5 і 6 красавіка — калі гэты паказчык зафіксаваны на ўзроўні 180 квадратаў, праўда, і расцэнка ў гэтыя дні — 49 рублёў), расцэнка за адзінку вымярэнне — 220 рублёў. Фактычна работнік выконваў аб'ём ад 20 да 60 квадратных метраў, таму дзённы заробак вагаўся ад 2 940 да 9 900 рублёў...

— Брыгадзір вядзе ўлік працоўных гадзін, заробак налічваецца згодна з дзейнымі ў гаспадарцы расцэнкамі, — распавёў Аляксей Мікалаевіч. — За красавік, такім чынам, было налічана крыху больш за 139 тысяч рублёў. Каваленка гэтыя грошы атрымліваць не стаў, матывуючы, што мала налічана. І адмовіўся выходзіць на працу. Не стаў пісаць і тлумачальную запіску. Апошні працоўны дзень у яго — 30 мая. На працягу далейшых месяцаў мы тройчы накіроўвалі яму заказныя лісты з просьбай падаць тлумачальную запіску. Усе іх паштальён вярнула назад. Тым не менш, работнік па-ранейшаму лічыўся ў штаце. І толькі ў верасні з'явіўся загад пра яго звальненні, прычым з таго дня, калі ён упершыню не выйшаў на працу. Гэта было зроблена па ўзгадненні з інспекцыяй па працы.

Але, як высветлілася далей, цяпер, калі б колішні работнік КСУПа і захацеў бы атрымаць зароблены раней сродкі, гэта ў яго б не атрымалася.

— Як і іншым работнікам, Каваленку выдзялялася сена. Калі ў працаўніка няма спагнанняў па працы, дзейнічае льгота: за гэтае сена з заробку вылічваецца толькі 10 працэнтаў яго кошту. Калі ж мела месца парушэнне працоўнай дысцыпліны, утрымліваюцца ўсе 100 працэнтаў, — сказаў далей кіраўнік КСУП «Ломавічы» Аляксей Рашэтнікаў. — Тут жа чалавека звольнілі, таму зароблены ім грошы пайшлі на пагашэнне доўгу перад гаспадаркай за тое сена, паколькі названая льгота ім была страчана.

Напрыканцы можна дадаць, што калі ў заяўніка не знікла жаданне звяртацца ў суд, тады для яго будзе карыснай наступная інфармацыя: згодна з Працоўным кодэксам, калі гаворка ідзе пра вырашэнне працоўных спрэчак (а наш выпадак да іх адносіцца) у судовым парадку, грамадзянін пры падачы іску вызваляецца ад выплаты дзяржпошліны.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАЦЯРПЕЛЫЯ ПРЫ ВЫБУХУ Ў ПІНСКУ ПЕРАРАЗМЕРКАВАНЫЯ ПА БАЛЬНІЦАХ БРЭСТА І МІНСКА

Перавод пацярпелых у клінікі абласнога цэнтра і сталіцы абумоўлены неабходнасцю лячэння ва ўмовах спецыялізаванага апёкавага аддзялення. Аб гэтым **БЕЛТА** паведаміў начальнік упраўлення аховы здароўя Брэсцкага аблвыканкама Ігар Ласіцкі.

Паводле яго слоў, учора з Пінска ў Брэст дастаўлены адзін пацярпелы, заўтра — яшчэ адзін. У Пінску рыхтуюць да выпіскі 29 кастрычніка жанчыну, якая атрымала чэрапна-мазгавую траўму і праходзіць лячэнне ў аддзяленні нейрахірургіі. Яе стан не выклікае трывогі ў медыкаў.

Такім чынам, растлумачыў Ігар Ласіцкі, на лячэнні ў Пінскай бальніцы пацярпелых у выніку выбуху не застанецца. Раней, паводле яго слоў, з Брэста і Пінска ў Мінск пераводзілі самых цяжкіх хворых. Асноўная нагрузка па аказанні спецыялізаванай медыцынскай дапамогі ляжа на сталічны апёкавы цэнтр, дзе на лячэнні будуць знаходзіцца 14 чалавек. У Брэсцкай абласной бальніцы будуць лячыцца 6 пацярпелых з Пінска.

ПАДПРАЦОЎКІ ГАЛОЎНЫХ БУХГАЛТАРАЎ

У Мазыры 40-гадовая галоўны бухгалтар аднаго з дзяржаўных прадпрыемстваў час ад часу займалася продажам вырабаў з золата. У ходзе расследавання крымінальнай справы, заведзенай у дачыненні да грамадзянкі, высветлена шмат выпадкаў рэалізацыі каштоўных ювелірных упрыгажэнняў, якія не мелі адбіткаў дзяржаўных прабірных кляймаў Беларусі або краін былога Саюза. Як паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, ёй дапамагала рабочая аднаго з мазырскіх прадпрыемстваў. А вось 60-гадовая жыхарка Гомеля, якая працавала на пасадзе галоўнага бухгалтара вытворчага кааператыва, уключыла недакладныя звесткі аб працэнтах накладных выдаткаў прадпрыемства ў бланкі разлікаў на вырабы, што пацягнула завышэнне вартасці будаўніча-мантажных работ і нанясенне страт дзяржаве ў памеры больш за 51 мільён рублёў. Гэтыя грошы яна вярнула пасля праверкі. Між тым, у адпаведнасці з Кодэксам аб адміністратыўных правапарушэннях, з вытворчага кааператыва і адказных асоб у адпаведныя бюджэты спагнаныя штрафы на агульную суму больш за 122 мільёны рублёў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

МАКАВЫ ДЗЯЛОК

У Мінску затрыманы 37-гадовы жыхар Мінскага раёна з буйной партыяй маку

Праваахоўнікі заспелі яго, паводле звестак прэс-афіцэра Фрунзенскага РУУС Алы Галубовіч, у момант збыту 96 кілаграмаў макавага насення, якое было расфасавана ў кілаграмовыя пакеты. Акрамя таго, у гандляра зелля ў аўтамабілі знойдзеныя і канфіскаваныя матэрыялы, якія выкарыстоўваюцца пры вырабе опію.

Як высветлілася, дзялок задавальняў «капрызы» сваіх кліентаў па поўнай праграме: ён не толькі на ўласнай машыне дастаўляў мак на ўказанае пакупнікамі месца, але таксама прадаваў апошнім і ацэтон, што выкарыстоўваецца пры вырабе зелля. Прычым у якасці аплаты за пастаўлены тавар не грэбаваў і крадзенай маёмасцю, прымаў у заклад каштоўныя рэчы, тэлефоны і нават дакументы. Акрамя таго, што ў дачыненні дылера складзены адміністратыўны матэрыял за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць, што цягне за сабой накладанне штрафу ў памеры да 100 базавых велічынь з канфіскацыяй тавару, таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў і атрыманай за мак выручкі, разглядаецца і пытанне аб прыцягненні яго да крымінальнай адказнасці.

Ігар ГРЫШЫН.

У ПЕНСІЯНЕРА СКРАЛІ 30 МІЛЬЁНАЎ

У Оршы 63-гадовы мужчына заявіў у міліцыю, што сярод белага дня ў яго скралі ажно трыццаць мільёнаў рублёў.

У «патайным» месцы ля кватэры невядомыя знайшлі ключы і ўвайшлі ў памяшканне. Хутка міліцыянеры знайшлі падазроных у крадзяжы. У адносінах да двух беспрацоўных, мясцовых жыхароў, завялі крымінальную справу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион состоится 2.12.2010 г. в 10.00 по адресу: 210600, г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, конференц-зал. Организатором аукциона является РУП «Белтелеком» в лице Витебского филиала РУП «Белтелеком», расположенного по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19.

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

Лот 1. Изолированное помещение цокольного этажа здания, расположенного по адресу: г. Новополоцк, ул. Молодежная, 30, пом. 1, удовлетворительного состояния общей площадью 67,7 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 592 375 рублей; размер задатка – 59 240 рублей; целевое использование – размещение офисов, магазинов, производственных площадей (за исключением вредных производств).

Лот 2. Три смежные комнаты 1-го этажа здания, расположенного по адресу: г. Новополоцк, ул. Якуба Коласа, 14; удовлетворительного состояния общей площадью 66,3 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 580 125 рублей; размер задатка – 58 010 рублей; целевое использование – размещение офисов, магазинов, производственных площадей (за исключением вредных производств).

Лот 3. Часть помещения 1-го этажа здания, расположенного по адресу: г. Полоцк, ул. Богдановича, д. 10, пом. 2; удовлетворительного состояния общей площадью 8,64 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 75 600 рублей; размер задатка – 7 560 рублей; целевое использование – размещение офисов, магазинов, производственных площадей (за исключением вредных производств).

Лот 4. Часть помещения 8-го этажа здания, расположенного по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19; удовлетворительного состояния общей площадью 45,02 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 393 925 рублей; размер задатка – 39 390 рублей; целевое использование – размещение офисов, производственных площадей (за исключением вредных производств).

Лот 5. Отдельное помещение 1-го этажа здания, расположенного по адресу: г. Орша, ул. Новаторов, 6; удовлетворительного состояния общей площадью 8,1 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 70 875 рублей; размер задатка – 7 090 рублей; целевое использование – размещение офисов, магазинов, производственных площадей (за исключением вредных производств).

Лот 6. Отдельное помещение 1-го этажа здания, расположенного по адресу: г. Орша, ул. Новаторов, 6; удовлетворительного состояния общей площадью 16,4 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 143 500 рублей; размер задатка – 14 350 рублей; целевое использование – размещение офисов, магазинов, производственных площадей (за исключением вредных производств).

Лот 7. Помещения 2-го этажа здания, расположенного по адресу: г. Витебск, ул. 14-я Полоцкая, 35а, удовлетворительного состояния, общей площадью 66,6 кв.м (отдельные помещения: 11,5 кв.м, 21,5 кв.м, 14,0 кв.м, вспомогательное помещение – коридор – 19,6 кв.м), срок аренды – не менее 3-х лет.

Помещение 11,5 кв.м: начальная цена продажи – 100 625 рублей; размер задатка – 10 100 рублей; целевое использование – размещение офисов, магазинов, производственных площадей (за исключением вредных производств).

Помещение 21,5 кв.м: начальная цена продажи – 188 125 рублей; размер задатка – 18 810 рублей; целевое использование – размещение офисов, магазинов, производственных площадей (за исключением вредных производств).

Помещение 14,0 кв.м: начальная цена продажи – 122 500 рублей; размер задатка – 12 250 рублей; целевое использование – размещение офисов, магазинов, производственных площадей (за исключением вредных производств).

При условии сдачи одному арендатору: 66,6 кв.м. начальная цена продажи – 582 750 рублей; размер задатка – 58 275 рублей; целевое использование – размещение офисов, магазинов, производственных площадей (за исключением вредных производств).

Коэффициент, устанавливаемый в соответствии с п.9.2 Положения о порядке определения размеров арендной платы при сдаче в аренду капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, их частей Указа Президента Республики Беларусь № 518 от 23.10.2009 г. № 518 составляет 3,0.

Документы на участие в аукционе принимаются с 29.10.2010 г. по 01.12.2010 г. в рабочее время (с 9.00 до 16.00) по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, каб. 509-п. Документы, поданные после 16.00 01.12.2010 г., не рассматриваются. Заключительная регистрация участников аукциона в день проведения аукциона с 9.00 до 10.00 по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, каб. 509-п.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

- перечисляет задаток на с/с № 3012109730015 в Первомайском отделении филиала ОАО «БПС-Банк» по Витебской области, МФО 150801307, УНП 300977657 Витебский филиал РУП «Белтелеком»;

- подает заявление на участие в аукционе;

- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;

- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;

- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;

- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Срок заключения договора аренды: в соответствии с действующим законодательством.

Телефон для справок (0212) 27 11 58, 27 29 42, 27 29 45, факс (0212) 27 18 81.

У БЕЛАРУСІ ЎДАКЛАДНЕНЫ ПАРАДАК ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ЖЫЛЛЁМ ДЗЯЦЕЙ-СІРОТ

Указ № 552 аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя ўказы Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 27 кастрычніка.

У мэтах забеспячэння празрыстых прававых механізмаў для задавальнення патрэбнасцяў грамадзян у паляпшэнні жыллёвых умоў указам вызначаны парадак уліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, і парадак забеспячэння іх жылымі памяшканнямі. Вызначаны таксама выпадкі прынятця мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі рашэнняў аб немагчымасці ўсялення гэтай катэгорыі дзяцей і прыраўнаваных да яе асоб у замацаваныя за імі жылыя памяшканні, а таксама права гэтай катэгорыі грамадзян на прадастаўленне ім жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання.

Акрамя таго, указам устанаўліваецца, што дзяржаўная падтрымка на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў можа аказвацца для рэалізацыі толькі аднаго выбранага грамадзянамі спосабу паляпшэння жыллёвых умоў.

У прыватнасці, грамадзяне, якія атрымалі без аўкцыёну зямельныя ўчасткі для будаўніцтва жылых дамоў, не могуць разлічваць на дзяржаўную падтрымку пры адначасовым будаўніцтве іншага жылля. У сваю чаргу грамадзянам, накіраваным на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў з дзяржаўнай падтрымкай у складзе арганізацыі забудоўшчыкаў або на заключэнне дагавора долевага будаўніцтва, да прыняцця рашэння аб зняцці іх з уліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў або адмовы грамадзян ад ажыццяўлення такога будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылога памяшкання зямельныя ўчасткі для будаўніцтва жылых дамоў без аўкцыёну не прадастаўляюцца.

Улік грамадзян, якія пражываюць у населеных пунктах, размешчаных на тэрыторыях сельсаветаў, будзе ажыццяўляцца адпаведнымі сельскімі выканаўчымі камітэтамі, а грамадзян, якія маюць права на атрыманне жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання, — сельскімі і раённымі выканаўчымі камітэтамі.

Указам таксама прадастаўлена права высокакваліфікаваным спецыялістам, якія працавалі за мяжой па кантракту і стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, атрымліваць па-за чаргой жылыя памяшканні ў інтэрнатах.

Указ уступае ў сілу з 1 студзеня 2011 года.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ПАРЛАМЕНТАРЫІ, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІЯ заканадаўцы прынялі ўдзел у працы міжпарламенцкіх структур, якія гуртуюць краіны на постсавецкай прасторы. Трохдзённае знаходжанне парламентарыяў у Санкт-Пецярбургу было багатым на падзеі.

Кіраўнік ніжняй палаты беларускага парламента Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА старшынстваваў на пасяджэнні Бюро Міжпарламенцкай Асамблеі ЕўрАзЭС. Калегі абмеркавалі канцэпцыі Асноў працоўнага заканадаўства ЕўрАзЭС і Асноў заканадаўства аб рынку каштоўных папер. Разгледзелі рэкамендацыі па гарманізацыі заканадаўства ў розных галінах.

Лідар беларускай дэлегацыі паўдзельнічаў таксама ў пасяджэнні Савета ПА АДКБ. Падчас яго праналізаваныя вынікі нефармальнага саміта ўдзельнікаў АДКБ (што прайшоў улетку ў Ерэване) і пленарнага пасяджэння ПА АБСЕ (летам у Осла). Парламентарыі абмеркавалі таксама ваенна-палітычную абстаноўку ў Цэнтральнаазіяцкім рэгіёне калектыўнай бяспекі АДКБ. А на чацвёртым пленарным пасяджэнні ПА АДКБ старшынёй асамблеі абраны Барыс Грызлоў, лідар расійскай Дзярждумы. Удзельнікі пасяджэння разгледзелі таксама вынікі работы па фарміраванні сістэмы крызіснага рэагавання ў рамках Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы і ход рэалізацыі мерапрыемстваў па святкаванні 65-годдзя Вялікай Перамогі.

З удзелам У. Андрэйчанкі прайшло і пасяджэнне Савета МПА СНД. На мерапрыемстве разгледжаныя рэкамендацыі для міжнародных назіральнікаў СНД, ацэнены ход падрыхтоўкі праекта Дагавора аб зоне свабоднага гандлю. Кіраўнік беларускай дэлегацыі таксама прысутнічаў на трыццаць пятым пасяджэнні МПА СНД, дзе быў прыняты шэраг праектаў мадэльных законаў. У прыватнасці, аб ідэнтыфікацыйных дакументах новага пакалення, тэлемедыцынскіх паслугах, памежнай бяспецы і іншыя.

Напрыканцы прайшла міжнародная парламенцкая канферэнцыя «АБСЕ і СНД: новыя магчымасці і перспектывы», прысвечаная старшынству Казахстана ў АБСЕ. На ёй выступіў і кіраўнік беларускай дэлегацыі. Уладзімір Андрэйчанка акцэнтаваў, што Беларусь падтрымлівае ініцыятывы і прыярытэты, азначаныя Казахстанам, у тым ліку і правядзенне саміта ў Астане.

Знайшоўся час і для двухбаковых сустрэч. Спікер ніжняй палаты беларускага парламента сустрэўся са сваім таджыкскім калегам Ш.Зухуравым. Засяродзіліся яны найперш на ўмацаванні гандлёва-эканамічных сувязяў. Гутарка ішла пра пастаўкі беларускай тэхнікі ў Таджыкістан, стварэнне там сумесных прадпрыемстваў і зборачных вытворчасцяў, магчымасці перапрацоўкі таджыкскай сельгаспрадукцыі на тэрыторыі нашай краіны. Не абмінулі і тэму прэзідэнцкіх выбараў, якія пройдуць у нашай краіне 19 снежня. Спадар Зухураў запэўніў, што дэпутаты Маджлісі Олі (таджыкскага парламента) абавязкова возьмуць удзел у назіранні ў складзе місій МПА СНД і ПА АБСЕ.

Уладзімір Андрэйчанка правёў перамовы і са старшынёй ніжняй палаты казахстанскага парламента У. Мухамяджанавым, які налета наведае Беларусь. Абодва спікеры лічаць мэтазгодным пашырыць транзітнае супрацоўніцтва краін і максімальна выкарыстоўваць магчымасці Мытнага саюза. А спадар Мухамяджанаў нават акцэнтаваў імкненне кіраўніцтва сваёй краіны давесці аб'ём тавараабароту з Беларуссю да 1,5 млрд долараў ЗША.

Зоя ВАРАНЦОВА.

Nemiroff — беларуская гарэлка

Вытворчасць напояў пад сусветна вядомым брэндам Nemiroff распачынаецца ў Беларусі.

Вытворчасць прадукцыі кампаніі Nemiroff наладжваецца на магутнасцях РУП «Мінск Крышталь». Гаворка пра напоі лінейкі класічных гарэлак — «Няміраўская», «Пшаніца ўкраінская адборная», «Азімая ўкраінская адборная», «Жытняя ўкраінская адборная» і «Nemiroff Лімон». Пры гэтым напоі вырабляюцца з беларускай сыравіны і па класічных рэцэптурах — з кантролем якасці спецыялістамі кампаніі Nemiroff. Інакш кажучы, гарэлка не будзе адрознівацца ад той, што вырабляецца ва Украіне.

Што ж да цаны, то для большасці беларусаў яна будзе прымальнай — 12 800 рублёў з пляшку.

Квота кампаніі Nemiroff на беларускім рынку вызначана ў 1 млн дал. у год. У выніку чакаецца, што наш рынак будзе цалкам забяспечаны класічнай гарэлкай кампаніі ўнутранага разліву. Прычым, адзначыў старшыня канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Іван ДАНЧАНКА, выкарыстанне айчынным прадпрыемствам вядомага брэнда дазволіць павялічыць паступленні ў беларускі бюджэт і экспарт гарэлкі. На бліжэйшы час тут вызначана мэта — 10 працэнтаў гарэлкі, вырабленай у Беларусі, павінна прадавацца за мяжой. І ў тым ліку гэта стане магчыма дзякуючы вытворчасці па ліцэнзіях іншаземных кампаній.

Дарэчы, варта заўважыць, што кампанія Nemiroff з'яўляецца адным з агульнапрызнаных вытворцаў алкагольных напояў у Еўропе і экспартуе сваю прадукцыю ў 55 краін свету.

Сяргей ГРЫБ.

Спорт-тайм

АЗАРАНКА САСТУПІЛА ЗВАНАРОВАЙ

Беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка, якая нядаўна выйграла Кубак Крамля, прайграла свой стартавы матч на выніковым турніры ў Досе. Яе суперніцай была расіянка Вера Званарова, з якой яна год таму абмянялася трэнерамі. Гульня з другой ракеткай свету Званаровай была прыкладна роўнай, і на працягу 2,5 гадзіны Віка мела ўсе шанцы на перамогу. Першы сэт доўжыўся 1 гадзіну 15 хвілін, і Віка саступіла яго толькі на тай-брэйку з лікам 6:7. У другім сэце наша тэнісістка таксама вяла з камфортнай перавагай 4:2, але прайграла з лікам 4:6. У сваёй групе Азаранка згуляе яшчэ два матчы.

ДЫНАМАЎЦЫ ПРАЙГРАЛІ МАСКОЎСКІМ АДНАКЛУБНІКАМ

Хакейнае «Дынама», якое пачало сваю серыю матчаў на «Бабруйск-Арэне», саступіла ў першым матчы аднаклубнікам з Масквы (1:3) у чэмпіянаце КХЛ. Яшчэ адна дзённая навіна: падчас матча атрымаў траўму капітан каманды Ёзэф Штумпел. Марэк Сікора меў усё ж такі рацыю, калі казаў, што арэна ў Бабруйску для хакеістаў чужая. Але «Дынама-Мінск» вымушаная на ёй гуляць па прычыне правядзення на «Мінск-Арэне» дзіцячага «Еўрабачання». Вернецца каманда на сталічную пляцоўку толькі 30 лістапада.

ГАНДБАЛІСТЫ СТАРТАВАЛІ НЯЎДАЛА

Гандбалісты саступілі ў стартавым матчы адборачнага турніру да чэмпіянату Еўропы-2012, які праходзіў у Ольбаргу на «Гігантум Арэне» зборнай Даніі (33:41), якая з'яўляецца фаварытам групы. Але ёсць і добрая вестка: у каманду пасля перапынку вярнуўся Сяргей Рутэнка. Тым часам у групе прайшоў яшчэ адзін матч — расіяне перайгралі швейцарцаў 36:34. 31 кастрычніка беларусы ў Брэсце прымаюць расійскую каманду. З квартэта ў кантынентальную частку кантынентальнага першынства выйдуць дзве мацнейшыя зборныя.

«ПАРТЫЗАН» ВЫБІЎ «ДЫНАМА» З КУБКА

Сталічны футбольны клуб «Дынама-Мінск» праводзіў кубкавы матч 1/8 розыгрышу супраць аўтсайдара першынства мінскага «Партызана». І нечакана саступіў 0:1. На 79-й хвіліне лёс сустрэчы вызначыў гол легіянера Ледзесмы. Гэта робіцца дрэннай традыцыяй сталічнага «Дынама» саступаць куды менш рэйтынгавым супернікам. Летась каманда прайграла гомельскаму ДСК з першай лігі. Вынік гэтага матча сумны яшчэ і тым, што мы хутчэй за ўсё не ўбачым «бела-блакітных» у еўракубках на наступны год. Кубак Беларусі зрабіў «ручкай» камандзе, а шанцы на медалі ў чэмпіянаце ў падапечных Уладзіміра Гольмака пакуль даволі ўяўныя (каманда займае чацвёртае месца, на 15 ачкоў адстаючы ад лідара БАТЭ і чатыры ачкі саступаючы трэцяму «Мінску»).

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Вельмі дарагая юшка

Увагу супрацоўнікаў Ганцавіцкай міжрайінспекцыі прыцягнуў грузавік «ЗІЛ-157», які знаходзіўся непадалёку ад вадаёма «Тухавіцкія разлівы»(Ляхавіцкі раён).

У аўтамабілі знаходзіліся трое: пенсіянер, вучань СШ і беспрацоўны. Калі інспектары «пакапаліся» ў аўтамашыне, то дасталі два акумулятары, пераўтваральнік току і 120 кг рыбы, здабытай пры дапамозе электратоку.

Пакуль ішла разборка, вадзіцель аўтамашыны кінуўся ў кусты і паспрабаваў уцячы, але яго дагналі. Была выклікана аператыўная група з Ляхавіцкага аддзела міліцыі, і цяпер разглядаецца пытанне пра завядзенне крымінальнай справы. Шкода, нанесеная прыродзе, ацэненая ў 26 млн 110 тысяч рублёў. Накладзены арышт на маёмасць у суме 9 млн 500 тысяч рублёў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Спакушаюцца цацкамі

З кватэры ў Гомелі выкрадзены электрааўтамат для гульні ў «страйкбол». Гаспадар, які вярнуўся дадому бліжэй да ночы, пабачыў, што замкі ў дзвярах пашкоджаныя і няма прылады для любімай кампутарнай забавы. А ў Жлобіне, дзе вялікая колькасць жыхароў горада займаецца вытворчасцю мяккіх цацак, з легкавой машыны было выкрадзена 40 «пушысцікаў». Непрацуючага грамадзяніна, які скарыстаўся тым, што акно ў «Мерседэсе» было адчынена, знайшлі разам з лёгкай і мяккай здабычай.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Абзац

◢ Швейцарская кампанія «Франк Мюлер» выкупіла 52% акцый ААТ «Мінскі гадзіннікавы завод». Аб'ём інвестыцый склаў суму, эквівалентную Br36 млрд. 516 млн. 450 тыс. Паводле звестак Мінпрама, грошы паступілі, і швейцарская кампанія стала ўласнікам 52% акцый гадзіннікавага завода. З наступнага года на прадпрыемстве пачнецца працэс тэхнічнага пераснашчэння.

◢ **У 13:30 на заводзе «Аўтагідраўзмацняльнік» у Барысаве пачаўся пажар. Выратавальнікі ліквідавалі ўзгаранне ў 14:06. Пацярпелых не было, абставіны высвятляюцца. Як мяркуецца, прычынай пажару стаў перагрэў гальванічнай печкі. Спецыялісты патлумачылі, чаму над заводам было шмат дыму: адбыўся перагрэў печы, у якой знаходзіліся шэсць тон алею. Алей загарэўся, а пры яго гарэнні вылучаецца шмат дыму.**

◢ У Мінску п'яны таксіст урэзаўся адразу ў тры дрэвы. За руль ён сеў пасля застолля і, крыху праехаўшы, выехаў на газон, дзе і «сустрэў» дрэвы. Пасажыр, стрыечны брат кіроўцы, атрымаў шматлікія траўмы. Пасля высветлілася, што ў крыві ліхача было 2,66 праміле алкаголю. За гэта яму пагражае штраф да 35 б.в. з пазбаўленнем права кіравання транспартам на 3 гады, яшчэ да 10 базавых — за ДТЗ. Давядзецца адказваць і за пашкоджанне зялёных насаджэнняў.

◢ **У Мінску студэнтка БДУ — грамадзянка Кітая — злавіла за руку кішэнніка. Яна ехала ў аўтобусе і заўважыла, што з кішэні ў яе знік кашалёк, у якім было амаль Br500 тыс. Да свайго здзіўлення, яна ўбачыла, як яго кладзе ў сваю кішэню адзін з пасажыраў. Кітаянка схапіла мужчыну і пачала клікаць на дапамогу. Курсанты Акадэміі МУС, якія ехалі ў аўтобусе, аператыўна затрымалі злодзея, а таксама яго саўдзельніка. Пазней высветлілася, што абодва нідзе не працуюць, маюць судзімасці.**

Поўны абзац

◢ У Харватыі запушчаны круіз для голых турыстаў. Незвычайнае тыднёвае марское падарожжа па Адрыятыцы арганізуе брытанская кампанія: турыстам прапануюць наведаць нудысцкія пляжы Харватыі. Каб не траціць час на распрананне, на борце круізнага лайнера адпачывальнікі будуць хадзіць галяком. «Голы» круіз абыдзецца не так дорага — ад 570 еўра за 7 дзён. Хадзіць голымі можна круглыя суткі, праўда, падчас сняданкаў, абедаў і вячэры турыстам усё ж прапануюць крыху апранацца — у мэтах бяспекі. Бо пракінуць талерку гарачага супу ці кубак гарбаты сабе, напрыклад, на жывот ці суседу на сцягно — занадта вострыя ўражанні нават для тых, хто прывык усюды хадзіць голым. Круіз разлічаны на падарожнікаў ва ўзросце ад 40 да 45 гадоў, лайнер пачне плаванне наступным летам.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

У МАГІЛЁВЕ «МІНІРАВАЛІ» ЧЫГУНАЧНЫ ВАКЗАЛ

А палове 12-ай ночы ў дзяжурную частку Магілёўскага УУС невядомая жанчына паведаміла пра мініраванне вакзала. Тэлефанаванне зрабілі з аўтамата на прывакзальнай плошчы. Пакуль усе службы разам шукалі выбуховае прыстасаванне, паступіла новае паведамленне па тэлефоне. На гэты раз каля тэлефона-аўтамата затрымалі жанчыну. Жыхарка Магілёўскага раёна, якой 48 гадоў, ужо была асуджана за падобнае правапарушэнне.

Алена КАЗЛОВА.

БУЛЬБА Ў ЦАНЕ

У сховішчы агародніны, якое належыць ААТ «Айчына» (Пружанскі раён), ноччу пабывалі зладзеі. Яны вырвалі прабой навяснога замка і вывезлі аж 9 тысяч 480 кг бульбы. Заведзена крымінальная справа.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЗЛАЧЫНСТВА РАСКРЫЎ... ВЫПАДКОВА

Супрацоўнік аператыўна-дзяжурнай часці Брэсцкай абласной ДАІ ехаў пасля працы па вуліцы Ленінградскай са сваім таварышам. Таварыш звярнуў увагу на аўтамабіль сваяка, за рулём якога сядзеў зусім незнаёмы чалавек. Гэта адразу выклікала падазрэнне. Пасля таго, як машына прыпаркавалася ля спарткомплекса, супрацоўнік дзяржаўтаінспекцыі і яго таварыш убачылі там дваіх маладых людзей, яны былі яўна нецвярозыя, у адзенні з плямамі крыві. У лічаныя імгненні міліцыянер адабраў ключы ў кіроўцы і выклікаў падмогу.

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 08 ноября 2010 г. в 15.00 состоится ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Бобруйскагромаш» (продавец), в составе следующих лотов (предмет торгов):

Лот № 1	Незавершенное капитальное строение с инвентарным номером 710/U-5535 (крытая стоянка испытательной техники) общ. пл. 364,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 13 в
Лот № 2	Незавершенное капитальное строение с инвентарным номером 710/U-5536 (экспериментально-производственный корпус) общ. пл. 3 775 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 13 б
Лот № 3	Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-5568 (бытовой городок – ремонт машин) общей площадью 688,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Шинная, 5

Организатор торгов	**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНН 102353509** *(р/с 3012035310012 в Филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской обл., код 331)*		
Место проведения торгов и подачи документов	г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация»		
Номер расчетного счета для перечисления задатка	Получатель платежа ОАО «Бобруйскагромаш» – р/с 3012000360025 в Первомайском отд. ОАО «БелПСБ» г. Бобруйска, код 329, УНН 700067572, ОКПО 00238776		
Общие сведения	**Лот № 1**	**Лот № 2**	**Лот № 3**
Начальная цена продажи, рублей без учета НДС	121 756 590 рублей, размер задатка 5 % – 6 087 830 руб.	962 236 861 рубль, размер задатка 5 % – 48 111 840 руб.	335 112 253 рубля, размер задатка 5 % – 16 755 610 руб.
Площадь земельного участка	**0,2069 га –** кадастровый № 741000000007001138, правовой режим – пост. пользование	**0,7153 га** – кадастровый № 741000000007001139, правовой режим – пост. пользование	**0,2457 га**, кадастровый № 741000000001000332, правовой режим – пост. пользование
Условия продажи	по лотам № 1 и № 2 – аукцион без условий; по лоту № 3 – подсобные помещения площадью 29,21 и 19,92 кв.м с тамбуром площадью 3,43 кв.м сданы в аренду до 31.12.2012 г.		
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов		
Условия оплаты	Определяются по согласованию Победителя торгов с Продавцом при заключении договора купли-продажи		
Срок подачи документов, осмотра лотов и внесения задатка	**включительно по 05 ноября 2010 г. до 16.00**		

****Более подробная информация об условиях участия в торгах, характеристиках предмета торгов, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, опубликована в газете «Рэспубліка» от 09.06.2010 г. (по лоту № 3) и от 20.08.2010 г. (по лоту № 1 и № 2).**

Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

Сведения о застройщике.

Открытое акционерное общество «Белбуд» создано и утверждено общим собранием учредителей 06.09.1994 года.

Целью создания общества является реализация инвестиционных проектов в различных сферах экономики Республики Беларусь, осуществление любых видов хозяйственной деятельности, не запрещенных законодательством.

ОАО «Белбуд» зарегистрировано 18.11.1994 Минским горисполкомом. Прошло перерегистрацию 10.02.2000 и решением Мингорисполкома № 149 зарегистрировано в ЕГР за № 100794022. УНН 100794022. ОКПО 28650455. Юридический адрес и местонахождение общества: улица Восточная, дом 133, офис 1, 220113, город Минск. Тел./факс 8 017 237 29 50.

Режим работы: понедельник–четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.30. Обеденный перерыв с 13.00 до 13.48.

Сведения о проектах строительства

В течение трех последних лет реализованы следующие инвестиционные проекты:

1. 180-квартирный 10-15-этажный жилой дом со встроенными помещениями по ул. Сырокомли, 38 в микрорайоне «Лошица-3».

2. 123-квартирный 9-этажный жилой дом по ул. Притыцкого, 109 в микрорайоне «Красный Бор-1».

3. 168-квартирный 22-этажный жилой дом по ул. Притыцкого, 160 в микрорайоне «Каменная Горка-1».

Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления деятельности «Проектирование и строительство зданий и сооружений I и II уровней ответственности и проведению инженерных изысканий для этих целей» № 02250/0589683 действительна до 14.03.2015 года.

Информация о проекте строительства

Цель проекта – строительство объекта «Многоквартирный жилой дом со встроено-пристроенными помещениями общественного назначения в микрорайоне «Каменная Горка – 1» по генплану № 39А в г. Минске».

Объект долевого строительства размещается во Фрунзенском административном районе г. Минска в микрорайоне «Каменная Горка-1» на свободном от застройки земельном участке.

Участок ограничен: запад, северо-запад – перспективное развитие 18-, 25-этажных жилых домов с подземными гараж-стоянками; север, северо-восток – благоустраиваемая территория; восток – перспективное размещение гипермаркета, ул. Кунцевщина, ст. метро «Каменная Горка», юг – ул. Притыцкого.

22-этажный жилой дом односекционный представляет собой равносторонний в плане треугольник с длиной около 40 м.

В градостроительном образе здания заложена идея – треугольная призма с гранями из стекла.

Жилой дом состоит из жилой части общей площадью квартир 10100 кв.метров, офисных помещений на первом этаже площадью 515 кв.метров, технического подполья, технического этажа.

Количество квартир в доме 168, в т.ч. однокомнатных 90, двухкомнатных 36, трехкомнатных 36 и четырехкомнатных 6. В техническом подполье размещены теплоузел, водомерный узел, помещение товарищества собственников, офисное помещение. Высота этажей от пола до пола 2.8 м. Лоджии застеклены.

В качестве несущей системы применен монолитный рамно-связевой железобетонный каркас с плоскими безригельными монолитными перекрытиями с поэтажно опертыми наружными стенами из ячеистого бетона оштукатуренных полимерным составом с последующим нанесением декоративно-защитного состава.

Несущий монолитный железобетонный каркас состоит из монолитных железобетонных колон, перекрытий и диафрагм жесткости.

Проектом предусмотрены все виды инженерного обеспечения. Пищеприготовление – электрическое. Запроектированы четыре лифта.

Объектами долевого строительства являются:

однокомнатные квартиры площадью 39,2 – 45,5; 47,6 кв.метров;

двухкомнатные квартиры площадью 61,0 – 64,5 кв.метров;

трехкомнатные квартиры площадью 87,1 – 91,1 кв.метров;

четырехкомнатные квартиры площадью 107,2 – 110,5 кв.метров.

Цена 1 кв.метра площади по СНБ 3.02.04-03 на дату опубликования проектной декларации для физических лиц, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий – 3650468 белорусских рублей. Для физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – 3908174 белорусских рубля.

Проектирование и строительство объекта осуществляется в соответствии с условиями договора № 369-Д от 14.10.2010 г. на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), заключенного с Мингорисполкомом.

Проектно-сметная документация разработана ОАО «Институт «Минскгражданпроект» в соответствии с актом выбора места размещения земельных участков от 03.11.2009 г. и утвержденным председателем Мингорисполкома 04.11.2009 г. Согласована Комитетом архитектуры и градостроительства Мингорисполкома № 06-03/87ф от 03.06.2010 г., Государственной экологической экспертизой Министерства природных ресурсов и охраны окружающей среды Республики Беларусь № 312 от 05.10.2005 г. в составе проекта «Детальный план жилого района Каменная Горка». Заключением РУП «Главгосстройэкспертиза» от 30.07.2010 г. № 881-15/10 рекомендована к утверждению.

Решением Мингорисполкома № 2327 от 14.10.2010 г., пункт 5, ОАО «Белбуд» предоставлен во временное пользование земельный участок площадью 0,8471 га, сроком до 01.11.2012 г. и разрешено строительство объекта на данном участке.

Начало строительства – ноябрь 2010 г.

Окончание строительства – декабрь 2012 г.

Строительство осуществляется на основании договора строительного подряда от 20.10.2010 г. № 16 с ООО «СУ-1 Белбуд».

Благоустройство территории включает организацию подъездов, проездов и автостоянок, пешеходных тротуаров и дорожек, устройство детских площадок, оборудование территории малыми архитектурными формами, озеленение.

Многоквартирные лестничные клетки, лестницы, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технический этаж и подполье, другие места общего пользования, несущие, ограждающие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, помещение товарищества собственников после ввода объекта в эксплуатацию поступают в общую собственность дольщиков.

Ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно в офисе ОАО «Белбуд» по ул. Восточная, 133, офис 1 или по телефону 237 29 50, 237 29 52, 237 29 53.

ОАО «Белбуд»

СЁННЯ

Месяц
Апошняя квадра 30 кастрычніка. Месяц у сузор'і Рака.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.03	17.42	9.39
Віцебск —	7.57	17.28	9.31
Магілёў —	7.54	17.32	9.38
Гомель —	7.46	17.33	9.47
Гродна —	8.18	17.58	9.40
Брэст —	8.14	18.03	9.49

Імяніны

Пр. *Івана, Лонгіна, Яўгена.*

К. *Віялеты, Серафіны, Міхала, Нарцыза, Тодара, Яцка.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра

Геамагнітныя ўзрушэнні



...у суседзяў

Дзве даты

29 верасня

1451 год — нарадзіўся Хрыстафор Калумб, мараплавальнік, іспанскі адмірал, першаадкрывальнік Сарагосава і Карыбскага мораў, Багамскіх і Антыльскіх астравоў, паўночнага ўзбярэжжа Паўднёвай Амерыкі і карыбскай берагавой рысы Цэнтральнай Амерыкі. Сярод вялікіх дзеячаў сусветнай цывілізацыі мала хто можа параўняцца з Калумбам па колькасці публікацый, прысвечаных яго жыццю, і адначасова — па колькасці «белых плям» у біяграфіі.

1918 год — на I Усерасійскім з'ездзе саюзаў рабочай і сялянскай моладзі ўтвараецца Расійскі камуністычны саюз моладзі (РКСМ), які ў 1924 годзе стаў Ленінскім, а з 1926-га — яшчэ і Усесаюзным саюзам.

Цытата дня

«Справа не ў тым, каб хутка бегаць, а ў тым, каб выбегчы раней».

Францыск Рабле (1494—1553), французскі пісьменнік.

КАБ НЕ НАШКОДЗІЦЬ МАЛАДЫМ

У былыя часы бацькі маладых не мелі месца за вясельным сталом. Яны маглі толькі на некаторы час прысесці, але не больш за тое. На працягу ўсяго вяселля ў іх была толькі адна задача: зрабіць усё магчымае і немагчымае для таго, каб вяселле атрымалася на славу ўсяму роду і каб максімальна захаваць маладых ад любых нечаканасцяў.

● Займаючыся падрыхтоўкай вясельнага стала, перш за ўсё паклапаціцеся пра рытуальныя прыборы для маладых. Пажадана, каб у іх усё было аднолькавым: два фужэры чырвонага (ахоўнага) колеру, дзве талеркі з аднолькавым малюнкам, дзве аднолькавыя лыжкі і два відэльцы. Нажы лепш зусім не класці («менш будуць рэзацца», г. зн. сварыцца паміж сабой, казалі старыя людзі).

● Перад тым як маладыя сядуць за вясельны стол, праверце, каб на іх крэслах ці пад крэсламі не было нічога насыпанага ці налітага і каб на іх месцы ніхто не садзіўся.

● Абавязковае правіла: маладыя павінны заходзіць за вясельны стол толькі па ходзе гадзіннікавай стрэлкі (па сонцы), а выходзіць у зваротным кірунку.

● Каб чалавек з дрэннымі намерамі «не сапсаваў» маладых, перад тым як госці сядуць за стол, хтосьці са старых людзей чытаў малітву або замову.

● Маладым раілі, каб на працягу ўсяго вяселля яны трымаліся за рукі — каб паміж імі ніхто не праходзіў, у адваротным выпадку шлюб будзе недаўгавечным. У былыя часы адразу ж пасля шлюбу на парозе царквы хросны бацька злучаў маладым рукі і перавязваў іх спецыяльна падрыхтаваным ручніком.

● За вясельным сталом першая выпітая чарка прысвячалася продкам (самым старэйшым прадстаўнікам роду). Другі раз паднімалі чаркі за здароўе бацькоў. І толькі ў трэці раз увага ўсіх гасцей пераходзіла на маладых. І тады чамусьці гарэлка ў чарках раптам станавілася нясмачнай — «горкай».

● У вясельным закліку «горка!» прыхаваны велізарны пласт народнай культуры, які выказваецца двума словамі: «Не нашкодзь!». Бацькі ці сваты прасілі ўсіх прысутных не нашкодзіць маладым, не сурочыць іх шчасце, будучых дзяцей, гаспадарку, поспех у справе і т. п. Давайце ўспомнім: калі мы глядзім на немаўля, нам тут жа хочацца выказаць словы захаплення: «які прыгожанькі, які харошанькі!», але народны этыкет забараняў падобныя вольнасці: калі прыгожы, то яго можа «выкрасці» нячыстая сіла. У сувязі з гэтым чалавек, які ўпершыню ўбачыў нованароджанага, павінен быў тройчы плюнуць і сказаць максімальна нейтральныя словы, маўляў, «падобны на бацьку», «гадуйся здаровенькі». У голасным «горка!» закладзены той самы прынцып — не нашкодзіць такім прыгожым і такім шчаслівым маладым.

● На працягу ўсяго вяселля маладыя павінны быць толькі разам, ніякія рытуальныя дзеянні, у тым ліку і танцы, не павінны разлучыць пару. Сёння добрай традыцыяй стаў першы танец, які жаніх і нявеста танцуюць у сярэдзіне кола, утворанага гасцямі.

● І яшчэ адна парада: чым менш спіртнога вып'юць маладыя падчас вяселля, тым спакайней будзе іх жыццёвы шлях.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

Жанчына — як інспектар ДАІ: абы-чаго нагаворыць, грошы адбярэ, настрой сапсуе, а ты яшчэ і вінаваты.

☺

— Як ты пазнаёміўся са сваёй жонкай?

— Ды сябры патэлефанавалі, запрасілі на вяселле. Сказалі, маўляў, жаніхом будзеш. Думаў — пажартавалі...

☺

У глыбокай-глыбокай пячоры знайшлі шкілет. Гэта быў чэмпіён свету па гульні ў хованкі.

АХОВА
ПАД ЗНАКАМ САВЫ

СУМЕСНЫ ВЫПУСК «ЗВЯЗДЫ» І ДЭПАРТАМЕНТА АХОВЫ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

„...кожнага супрацоўніка Дэпартамента аховы вызначае пачуццё абавязку і адказнасці, мужнасць і бясстрашнасць, выдатная фізічная форма і ўменне хутка арыентавацца ў самай непрадказальнай сітуацыі"

„Мы можам ганарыцца тым, што служба аховы сёння асацыюецца з такімі дасягненнямі як рэальная і якасная ахова грамадзян, грамадства і дзяржавы ад многіх і многіх негатыўных праяў. Наш дэпартамент служыць трывалым фундаментам умацавання законнасці і правапарадку"

СЁННЯ СУПРАЦОЎНІКІ І ВЕТЭРАНЫ ДЭПАРТАМЕНТА АХОВЫ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АДЗНАЧАЮЦЬ ЧАРГОВУЮ ГАДАВІНУ З ДНЯ ЎТВАРЭННЯ. ВІНШУЕМ З ГЭТАЙ ПАДЗЕЯЙ РАБОТНІКАЎ МІЛІЦЫІ І ГРАМАДЗЯН, ЯКІЯ СУМЛЕННА СЛУЖАЦЬ ПАД ЗНАКАМ САВЫ!

Паважаныя супрацоўнікі і ветэраны Дэпартамента аховы!

Ад імя кіраўніцтва Міністэрства ўнутраных спраў віншую вас з 58-й гадавінай утварэння службы аховы!

Сёння выкананне многіх і многіх задач, якія стаяць перад праваахоўным ведамствам, проста немагчымае без Дэпартамента аховы — па-сапраўднаму моцнага і мабільнага падраздзялення. Гэта калектыў надзейных і прафесійных салдат правапарадку, якія кругласутачна знаходзяцца на пярэднім краі супрацьстаяння злачыннасці ў самых розных формах яе праяўлення, ад злачынстваў маёмаснага характару да фактаў гвалту над асобай і пагроз жыццю і здароўю нашых грамадзян.

Асабовы склад дэпартамента забяспечвае надзейную ахову кватэр нашых грамадзян, іх маёмасці, ахоўвае дзяржаўныя і сацыяльныя аб'екты, стрымлівае і прадухіляе беззаконне, вяртае дзяржаве і ўладальнікам усіх формаў уласнасці немалыя сумы. Неадкладна рэагуючы на сігналы аб злачынствах і здарэннях, супрацоўнікі аховы затрымліваюць злачынцаў, забяспечваюць належны грамадскі парадак. Без сумнення, вы сёння запатрабаваныя грамадствам і патрэбныя людзям. Пра гэта сведчыць і давер грамадзян, якія, нягледзячы на эканамічныя і іншыя цяжкасці, па-ранейшаму бачаць у вас гарантаў бяспекі асобы і захаванасці матэрыяльнага дабрабыту. Упэўнена магу сказаць, што кожнага супрацоўніка Дэпартамента аховы вызначае пачуццё абавязку і адказнасці, мужнасць і бясстрашнасць, выдатная фізічная форма і ўменне хутка арыентавацца ў самай непрадказальнай сітуацыі.

Вы пастаянна ўдасканальваецеся ў прафесійным плане, распрацоўваеце новаўвядзенні тактыкі і стратэгіі супрацьдзеяння крыміналу, укараняеце ўнікальныя тэхнічныя сродкі, пашыраеце сферы дзейнасці. Вамі рухае шчырае жаданне зрабіць жыццё грамадзян спакойным і бяспечным, унесці пасільную лепту ў тое, каб дзяржава адчула сябе здаровай ва ўсіх сферах, моцнай і квітнеючай. Вам ёсць чым ганарыцца!

Жадаю асабоваму складу Дэпартамента аховы прафесійных поспехаў, сілы і мужнасці пры выкананні службовага абавязку. Здароўя, удачы і дабрабыту вам, а таксама вашым родным і блізкім. Дзякуй за ваша годнае стаўленне да высакароднай справы!

Міністр унутраных спраў Рэспублікі Беларусь генерал-маёр міліцыі А.Н. КУЛЯШОЎ.

Паважаныя калегі!

За 58 гадоў свайго існавання наша служба прайшла няпросты, але годны і слаўны шлях. Сёння Дэпартамент аховы ўяўляе сабой дастаткова важнае падраздзяленне ў сістэме Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. Кіраўніцтвам краіны нам даручана выкананне складаных і адказных задач у супрацьстаянні злачыннасці пры замаху на дзяржаўную ўласнасць. А грамадзяне краіны нам давяраюць захаванасць сваіх матэрыяльных даброт і, без перабольшвання, свае жыцці. Наш шматлікі калектыў, які складаецца з прадстаўнікоў многіх спецыяльнасцяў, з гонарам выконвае гэтую няпростую работу. Мы можам ганарыцца тым, што служба аховы сёння асацыюецца з такімі дасягненнямі як рэальная і якасная ахова грамадзян, грамадства і дзяржавы ад многіх і многіх негатыўных праяў. Наш дэпартамент служыць трывалым фундаментам умацавання законнасці і правапарадку.

Усе нашы поспехі і дасягненні — гэта вынік самаадданага і прафесійнага стаўлення да даручанай справы кожнага афіцэра, супрацоўніка, служачага, на якой бы пасадзе ён не знаходзіўся. Кожны з вас аддана служыць сваёй краіне і народу і тым самым уносіць значны ўклад у агульную для ўсіх нас справу ўмацавання бяспекі і захавання законных правоў і інтарэсаў грамадзян.

Асаблівыя словы падзякі хачу выказаць ветэранам службы аховы, якія прысвяцілі сваё жыццё такой важнай і патрэбнай прафесіі. Мы цэнім ваш вопыт у справе супрацьдзеяння злачыннасці, унёсак у выхаванне і станаўленне маладога пакалення супрацоўнікаў, з удзячнасцю пераймаем у вас традыцыі высакароднай справы!

Я шчыра ўпэўнены, што з такім цудоўным калектывам аднадумцаў і пры падтрымцы старэйшых пакаленняў вартавых парадку мы з гонарам і якасна выканаем усе задачы, якія стаяць перад намі.

Жадаю вам, паважаныя калегі, заўсёды захоўваць бадзёрасць духу, міліцэйскую кемлівасць і веру ў справядлівасць! Дабра і міру вам, вашым родным і блізкім!

Начальнік Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь палкоўнік міліцыі С.А. БУЙНОЎСКІ.

НАВАСЕЛЛЕ — СПРАВА СУР'ЁЗНАЯ

Яно садзейнічае аўтарытэту службы

Якасці выканання службовых задач у немалой ступені садзейнічаюць умовы, у якіх працуе асабовы склад. Гэта разумее кіраўніцтва Дэпартамента аховы. Значныя сродкі і намаганні штогод накіроўваюцца на гэту сферу развіцця рэгіянальных падраздзяленняў. Сёлета адразу 2 аддзелы аховы Мінскай вобласці адсвяткавалі навасселле: камфартабельныя рабочыя месцы атрымалі супрацоўнікі ў Валожыне і Крупках.

2 сакавіка асабовы склад Валожынскага аддзялення пераехаў у новыя і ўтульныя кабінеты, якія размясціліся ў новым будынку мясцовага аддзялення сувязі. Падраздзяленню быў выдзелены цэлы паверх. Пераезд быў сапраўды доўгачаканым, паколькі з моманту свайго ўтварэння ў 1967 годзе калектыў туліўся ў будынку РАУС, займаючы каля 60 квадратных метраў плошчы. Выдзеленыя грашовыя сродкі дазволілі «засяліць» плошчу ў 340 квадратных метраў. Цяпер супрацоўнікі могуць цалкам аддацца выкананню службовых абавязкаў, не адцягваючыся на бытавыя праблемы. Начальнік Валожынскага аддзялення маёр Валерый Мамонька прыняў сімвалічны ключ ад будынка ва ўрачыстай абстаноўцы. Па добрай традыцыі, мясцовы настаяцель прачытаў малітву, а затым асвяціў рабочыя кабінеты, пажадаўшы асабоваму складу плённай працы на карысць людзей. Дарэчы, навасселле станоўча адбілася на выніках працы: за паўгода паказчыкі службовай дзейнасці ўзраслі ў разы.

Следам за калегамі эстафету перанялі ў Крупках. Гэтымі днямі адбылося адкрыццё новага будынка Крупскага аддзела аховы, які будаваўся каля двух гадоў. Да гэтага падраздзяленне размяшчалася ў пераабсталяванай барцоўскай зале мясцовага РАУС. Новы будынак адпавядае ўсім сучасным стандартам. Як адзначаюць у калектыве, нават немагчыма параўноўваць ранейшыя ўмовы з цяперашнімі. Сёння амаль у кожнага ёсць прасторны кабінет, абсталяваны сучаснай тэхнікай і камфартабельнай мэбляй. Не засталіся без увагі і «чатырохногія супрацоўнікі» — для службовых сабак абсталяваны персанальныя вальеры. Службовы транспарт «пераехаў» у новыя гаражы. Для прафесійнай падрыхтоўкі створаныя спецыяльныя класы, трэнажорная зала і душавыя.

Начальнік Крупскага аддзела аховы падпалкоўнік Мікалай Макарэвіч шчыра рады за свой калектыў. Бо супрацоўнікі працуюць непасрэдна з грамадзянамі і арганізацыямі, таму выдатная сучасная матэрыяльная база падраздзялення значна падымае аўтарытэт у вачах мясцовых жыхароў. Расце колькасць і эфектыўнасць працы асабовага складу.

Калектывы Валожынскага і Крупскага падраздзяленняў аховы са словамі ўдзячнасці звяртаюцца да кіраўніцтва дэпартамента за аказаную дапамогу ва ўзвядзенні будынкаў, стварэнне спрыяльных умоў працы, а таксама за разуменне ў вырашэнні нядаўніх праблем супрацоўнікаў.

НОВЫЯ РУБЕЖЫ

Ахова Фрунзенскага раёна сталіцы: цяпер 10 тысяч уладальнікаў кватэр могуць спаць спакойна

Фрунзенскі раён Мінска, без перабольшвання, з'яўляецца адным з самых напружаных у рэспубліцы ў плане аператыўнай абстаноўкі. Прыемна, што самі жыхары раёна цвяроза ацэньваюць сітуацыю і клапоцяцца пра захаванасць сваёй уласнасці. Калі ўсяго ў сталіцы пад апекай падраздзялення Дэпартамента аховы знаходзіцца 48 тысяч памяшканняў з асабістай маёмасцю грамадзян, то пятая частка ад гэтай колькасці сканцэнтраваная ў Фрунзенскім раёне. Нядаўна быў заключаны юбілейны 10-тысячны дагавор на ахову кватэры. У сферы забеспячэння бяспекі жылля гэты паказчык — самы значны ў рэспубліцы. Для параўнання можна прывесці наступныя лічбы: у Гродзенскай і Брэсцкай абласцях ахоўваецца 8,5 і 12 тысяч кватэр адпаведна. Нядаўна ва ўрачыстай абстаноўцы, у прысутнасці журналістаў рэспубліканскіх сродкаў масавай інфармацыі, начальнік Фрунзенскага аддзела аховы падпалкоўнік міліцыі Уладзімір Валодзін уручыў юбілейнаму кліенту — Таццяне Клімянковай — кветкі і памятныя сувеніры **(на фота)**.

Фрунзенскаму аддзелу, якому летась споўнілася 50 гадоў, ёсць чым ганарыцца. З пачатку года нарады падраздзялення ажыццявілі больш за 20,5 тысячы экстранных выездаў, амаль 11,5 тысячы з іх — па сігнале «трывога», больш як 2 тысячы — на «спрацоўку» кнопак экстраннага выкліку міліцыі. Усе гэтыя паказчыкі — самыя значныя сярод іншых аддзелаў сталіцы. Як правіла, злачынцы стараюцца абыходзіць бокам аб'екты, якія знаходзяцца пад апекай падраздзялення аховы. Тым не менш, сёлета міліцыянерамі Фрунзенскага аддзела прадухілена 5 спробаў пранікнення на аб'екты, якія ахоўваюцца. Дарэчы, аб'ектаў, якія ўяўляюць асаблівую значнасць для сталіцы і нават краіны, на тэрыторыі раёна нямала. Напрыклад, у студзені ўведзены ў эксплуатацыю спартыўны комплекс «Мінск-Арэна», на працягу ўсяго перыяду будаўніцтва якога захаванасць будматэрыялаў і тэхнікі была забяспечана асабовым складам аддзела.

ПРЫВЫК ПРАЦАВАЦЬ АД ДУШЫ

Іван Арсеньевіч Каратай ужо больш за дзесяць гадоў на заслужаным адпачынку і... працуе ахоўнікам Навагрудскага аддзела аховы. Яго сённяшняе месца працы — ААТ «Навагрудскі масларобны камбінат». Іван Арсеньевіч да даручанага ўчастка працы ставіцца сумленна і годна. Пільны ахоўнік асабіста прадухіліў тры сур'ёзныя крадзяжы прадукцыі з прадпрыемства. Зрэшты, такім прынцыповым, уважлівым і цалкам адданым справе ён быў заўсёды.

30 гадоў Каратай прысвяціў службе ў Навагрудскім райаддзеле міліцыі. Быў участковым інспектарам, на тэрыторыі Любчанскага сельсавета абслугоўваў 18 вёсак, уяўляючы для больш чым пяці тысяч вяскоўцаў усе органы ўнутраных спраў у сваёй асобе. Людзі паважалі свайго ўчастковага. Калі ў мэтах службовай неабходнасці Івана Каратая перавялі ў крымінальны вышук, а замест яго ў раён накіравалі іншага інспектара, мясцовыя жыхары звярнуліся з пісьмом да Міністра ўнутраных спраў з просьбай «вярнуць нашага ўчастковага», і іх пажаданні былі ўлічаныя. Каратай працаваў ад душы, з уласцівым яму тэмпераментам і воляй. Даражыў гонарам мундзіра і выконваў задачы дакладна і прафесійна. У працы часта праяўляў мужнасць, спрыт і прыродную

кемлівасць. У 1991 годзе Івану Арсеньевічу было прысвоена ганаровае званне «Заслужаны ўчастковы інспектар БССР» з уручэннем пагонаў падпалкоўніка міліцыі. За шматгадовую бездакорную службу ў міліцыі Іван Каратай узнагароджаны 8 медалямі і нагруднымі знакамі МУС СССР і Рэспублікі Беларусь, а грамат і падзяк — проста не пералічыць.

Іван Арсеньевіч і сёння актывіст ва ўсім. Ён рэгулярна ўдзельнічае ў выхаванні маладога пакалення, аказвае садзейнічанне ў ахове грамадскага парадку, прапагандзе дзейнасці міліцыі, удзельнічае ў многіх значных мерапрыемствах, што праводзяцца Навагрудскім аддзелам аховы і РАУС. Ён пераканаты, што якой бы складанай і напружанай ні была праца праваахоўнікаў, яна застаецца адной з самых ганаровых і запатрабаваных, паколькі няма працы больш высакароднай, чым служэнне свайму народу.

Матэрыялы спецвыпуску падрыхтавалі Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Аляксандр ГЕРАСІМАЎ, Алена ЯРМАЛІНСКАЯ, Вольга КІПЧАНКА, Аксана САЛЯНЮК, Наталля ЛЕРНАТОВІЧ, Андрэй МАСЦЕРАЎ, Мікалай ЛОЙША, Аляксандр АКСЁНАЎ.

НЕ ПАМЫЛІЎСЯ Ў ВЫБАРЫ ПРАФЕСІІ

Адным з самых вартых прадстаўнікоў аховы Брэсцкай вобласці з'яўляецца міліцыянер-вадзіцель аператыўна-дзяжурнай службы Маскоўскага (г. Брэста) аддзела прапаршчык міліцыі Уладзімір Максімук.

Уладзімір у падраздзяленні служыць з 1995 года. У 90-х гадах маладому хлопцу, які працаваў у будаўнічым трэсце № 8, відаць, наканавана было выбраць прафесію міліцыянера. З самага лепшага боку ён праявіў сябе яшчэ ў рабочым атрадзе садзейнічання міліцыі, а затым ахвотна прыняў прапанову ўступіць у яе рады.

Рамантычныя настроі Уладзіміра зніклі, як толькі ён пачаў выкананне службовых абавязкаў у новай якасці. Адно з першых дзяжурстваў у раёне Партызанскага праспекта завяршылася затрымкай злачынцы. Невядомы сарваў з дзяўчыны залатыя ўпрыгажэнні і кінуўся ўцякаць. Рабаўніку, магчыма, удалося б згубіцца сярод мінакоў, калі б не ўменне хутка цяміць Уладзіміра Максімука. Менавіта ён «вылічыў» і затрымаў рабаўніка.

Самым сур'ёзным выпрабаваннем за гады службы прапаршчыка Максімука, па яго ацэнцы, стала затрыманне трох злачынцаў, якія ўчынілі забойства мужчыны на аўтобусным прыпынку. Ім не ўдалося пазбегнуць адказнасці за злачынства.

У рабоце аператыўна-дзяжурнай службы аддзела ёсць свае асаблівасці і тонкасці. Уладзімір набываў і «шліфаваў» навыкі, прайшоўшы за 15 гадоў шлях ад памочніка камандзіра ўзвода да камандзіра аддзялення. Прапаршчык неаднаразова быў адзначаны кіраўніцтвам аддзела, абласнога ўпраўлення і Дэпартамента аховы. У актыве ўзнагарод Уладзіміра — нагрудны знак «За адзнаку», медаль «90 гадоў міліцыі», шэраг іншых заахвочванняў. Ён з'яўляецца выдатнікам міліцыі і настаўнікам. Пад яго чуйным кіраўніцтвам вопыт у міліцэйскай справе набылі многія супрацоўнікі аддзела. А сёння і сын Уладзіміра вучыцца ў Акадэміі МУС. Відаць, прыклад бацькі аказаў вялікі ўплыў на выбар прафесіі Максімука-малодшага. Чамусьці не ўзнікае сумненняў, што праз некалькі гадоў сям'я Максімукоў стане вартай міліцэйскай дынастыяй.

МІЛІЦЫЯНЕР-КІНОЛАГ. ПАСАДА ЦІ ПРЫЗВАННЕ?

Няпроста адказаць на гэта пытанне. У многіх з нас ёсць дамашнія гадаванцы. Нас прыцягвае іх адданасць. Па вечарах яны сваім цяплом, бурчаннем, пяшчотай супакойваюць нас пасля цяжкага працоўнага дня. А ў міліцыянера-кінолага не заўсёды ёсць час расслабіцца са сваім гадаванцам: трэніроўкі, харчаванне, служба ў гарачыню і ў сцюжу — той яшчэ графік!

Службова-вышуковыя сабакі ў падраздзяленнях аховы выкарыстоўваюцца даўно. У 1986 годзе ў Полацку праходзілі рэспубліканскія спаборніцтвы міліцыянераў-кінолагаў. Тады службовыя сабакі туліліся ў цесных вальерах, выгульваліся на 100 квадратных метрах. У той час дрэсіроўкай, харчаваннем і выгулам сабак займаўся Аляксандр Ягоравіч Бурдэнка. Ён аддаў службе ў міліцыі больш за дваццаць гадоў і сёння з'яўляецца заслужаным ветэранам Полацкага аддзела аховы, працягваючы працаваць «па спецыяльнасці». Магчыма, яго цікавыя шматлікія расказы пра службовае сабакаводства сыгралі сваю ролю ў тым, што адзін з міліцыянераў-кіроўцаў аддзела пераквалiфікаваўся ў міліцыянера-кінолага. Гаворка ідзе пра Аляксея Пятрова **(на фота — у цэнтры)**.

Ужо шэсць гадоў прапаршчык Пятроў прызнаецца лепшым міліцыянерам-кінолагам Полацкага аддзела аховы, бярэ ўдзел у многіх рэспубліканскіх спаборніцтвах. А з чаго ўсё пачыналася?

У 1998 годзе Аляксей уладкаваўся вартаўніком у Полацкі аддзел аховы, а праз два месяцы ён быў накіраваны ў вучэбны цэнтр аб'яднання «Ахова» пры МУС для праходжання першапачатковай падрыхтоўкі. Так пачалася міліцэйская служба.

6 гадоў Пятроў нёс службу ў групе затрымання ў якасці міліцыянера-кіроўцы. У аддзеле ўжо была наладжана кіналагічная служба. Быў пабудаваны новы гадавальнік службовага сабакаводства. У экіпажы Аляксея тры з лішнім гады быў і міліцыянер-кінолаг з службовым сабакам. Нарэшце Пятроў не вытрымаў і захацеў паспрабаваць сябе ў працы з чатырохногімі ахоўнікамі. Некамплект кінолагаў і сабак аказаўся «на руку». Аляксей узяў шчанюка нямецкай аўчаркі і пачаў спасцігаць азы выхавання. Каб праводзіць больш часу з Яўгенікай, прынёс сабаку дамоў. Жонка прыняла новага члена сям'і.

Быццам адчуваючы, што акружаная любоўю і клопатам, Яўгеніка стала паказваць свае самыя лепшыя якасці. У лістападзе 2005 года яна стала прызёрам рэспубліканскай спецыялізаванай выставы сярод нямецкіх аўчарак. Следам атрымала яшчэ

некалькі прызавых месцаў на іншых выстаўках. К 2010 году Яўгеніка на міжрэгіянальных турнірах становіцца пераможцай за спартыўную і спецыяльную дрэсіроўку. Безумоўна, усе ўзнагароды Яўгенікі — гэта заслугі Аляксея. А разам яны — пастаянныя «зоркі» мясцовых СМІ і ўлюбёнцы дзяцей на розных мерапрыемствах.

За добрыя вынікі ў службе Аляксей быў прызначаны малодшым інспектарам-кінолагам і нёс службу сумесна з работнікамі Полацкага лясгаса па спыненні парушэнняў у сферы прыродаахоўнага заканадаўства. У 2008—2010 гадах ім асабіста было спынена мноства незаконных высечак лесу і яго крадзяжоў. Спынена 28 фактаў незаконнага палявання і рыбалоўства.

За ўвесь перыяд службы прапаршчыкам Пятровым затрымана нямала падазроных ва ўчыненні злачынстваў. А яго роля ў якасці міліцыянера-кінолага, які выязджае з службовым сабакам у складзе следча-аператыўнай групы аддзела міліцыі, часам і наогул неацэнная. Часта час, які праходзіць з моманту ўчынення крадзяжу да заявы пацярпелага, не дазваляе раскрыць злачынства па «гарачых слядах». Менавіта тут на дапамогу прыходзіць кінолаг з сабакам. Толькі за апошнія паўтара года Аляксей з Яўгенікай дапамаглі раскрыць 8 злачынстваў, расследаванню якіх нярэдка перашкаджалі дрэнныя ўмовы надвор'я.

На пытанне пра хобі Аляксей з усмешкай адказвае: «Яўгеніка — маё хобі, як і таварыш па службе». І сапраўды, за час свайго знаходжання на пасадзе, ён прывіў сабаку куды больш якасцяў і навыкаў, чым патрабуюць інструкцыі.

Сёння прапаршчык Пятроў — памочнік камандзіра ўзвода міліцыянераў-кінолагаў. Увесь вольны час ён праводзіць у гадавальніку службовага сабакаводства, дапамагаючы маладым кінолагам, увасабляючы варты прыклад для пераймання.

ЧАЛАВЕК НА СВАІМ МЕСЦЫ

Ужо 18 гадоў міліцыянер-кіроўца групы затрымання Бабруйскага аддзела аховы прапаршчык Мікалай Мірановіч адданы сваёй прафесіі. На яго погляд, чалавек павінен знайсці сваё месца ў жыцці, атрымліваць ад працы задавальненне і адчуваць сябе ўпэўнена.

На міліцыянера-кіроўцу ўскладаецца вялікая адказнасць у час нясення службы. Кіроўца заўсёды павінен быць сабраны, абавязваны выконваць правілы дарожнага руху, арыентавацца ў горадзе, ведаць размяшчэнне ахоўваемых аб'ектаў для правільнага і хуткага пад'езду да іх. Навыкі прафесійнага ваджэння дапамагаюць кваліфікавана ўдзельнічаць у аперацыях «Перахоп», за лічаныя хвіліны прыбываць на месца «спрацоўкі».

Спецыфіка службы ў міліцыі нялёгкая: ненармаваны працоўны дзень, начныя дзяжурствы, выклікі на здарэнні, звышурочная праца ў святы і выхадныя. Але ўсё гэта дапаўняе надзейны міліцэйскі тыл — сям'я. Заўсёды прыемна вяртацца дамоў, дзе чакаюць жонка і дзве дачкі, якія душы не чуюць у бацьку і заўсёды з нецярпеннем чакаюць.

Вольны час Мікалай Канстанцінавіч аддае сям'і. Але ёсць і хобі — рамонт аўтамабіляў. Так што, прафесію выбраў нездарма.

ЭЛЕКТРАМАНЦЁРЫ З ГОМЕЛЯ — ЛЕПШЫЯ Ў РЭСПУБЛІЦЫ

Сярод прадстаўнікоў розных прафесій і спецыяльнасцяў, якіх у Дэпартаменце аховы нямала, рэгулярна праводзяцца агляды-конкурсы прафмайстэрства. Мэта такіх мерапрыемстваў — павышэнне прафесіяналізму, абмен вопытам, выяўленне лепшых па прафесіі.

Нядаўна ў Гомелі завяршыўся 24-ы рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства электраманцёраў ахоўна-пажарнай сігналізацыі на званне «Лепшы па прафесіі». Першыя месцы па ўсіх чатырох намінацыях занялі прадстаўнікі Гомельскага абласнога ўпраўлення дэпартамента. Конкурсы сярод электраманцёраў стымулююць творчы падыход у выкананні службовых абавязкаў работнікаў гэтай спецыяльнасці, развіваюць рацыяналізатарскія навыкі.

Першы этап конкурсу праводзіўся ў саміх рэгіянальных падраздзяленнях аховы сярод работнікаў, занятых абслугоўваннем сістэм сігналізацыі на аб'ектах і кватэрах грамадзян, электраманцёраў ахоўна-пажарнай сігналізацыі, асобаў, адказных за рамонт і наладку сістэм перадачы паведамленняў. Пераможцы I этапу ўзялі ўдзел у наступным конкурсе, які праводзіўся ўжо ў абласных і Мінскім гарадскім упраўленнях. На трэцім этапе конкурсу электраманцёры-пераможцы папярэдняга этапу сустрэліся на гомельскай зямлі.

Лепшых вызначалі ў трох «намінацыях». Сярод электраманцёраў ахоўна-пажарнай сігналізацыі па абслугоўванні сістэм сігналізацыі на аб'ектах і кватэрах грамадзян «Лепшым па прафесіі» ў асабістым заліку сталі прадстаўнікі каманды Гомельскага абласнога ўпраўлення аховы Павел Ярмоленка з Цэнтральнага (г. Гомеля) аддзела і Аляксей Гуцаў з Навабеліцкага (г. Гомеля) аддзела, 2-е месца занялі прадстаўнікі каманды Магілёўскага абласнога ўпраўлення, 3-е месца — за двума спецыялістамі з Мінска.

Сярод электраманцёраў ахоўна-пажарнай сігналізацыі па тэхнічным абслугоўванні і рамонце сродкаў перадачы паведамленняў першым стаў Аляксей Елкін з Чыгуначнага (г. Гомеля) аддзела, другім — кіраўнік каманды Віцебскага абласнога ўпраўлення, трэцім — прадстаўнік каманды Магілёўскага абласнога ўпраўлення.

«Лепшым па прафесіі» сярод электраманцёраў ахоўна-пажарнай сігналізацыі майстэрняў па рамонце тэхнічных сродкаў аховы быў прызнаны Уладзімір Карчэўскі з Гомельскага аблупраўлення, другім — электраманцёр з Магілёва, трэцім — з Віцебска.

У камандным заліку месцы размеркаваліся наступным чынам: «золата» — за камандай з Гомеля, «серабро» — за камандай з Магілёва і «бронза» — за мінчанамі.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 5274. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12